# АД «ЗВЯЗДЫ»... ГАСПАДАРАМ...

***Тупее слых,***
***Слабее зрок,***
***І галава ўжо не тая...***
***Але ж выпісваю «Звязду»!***
***Чытаю...***
**Прыкладна так пісаў пра сябе адзін з адданых сяброў газеты ў свае амаль 90!**
**Не ў памяці ўжо, ці дасылаў ён карткі на розыгрыш прызоў? Магчыма, і не. Але ж хто-ніхто па-ранейшаму, з квартала ў квартал, робіць гэта, каб потым было на што паспадзявацца, пачакаць, што пакажа розыгрыш, каб пасля яго цяжка ўздыхнуць (маўляў, зноўку міма!) альбо...**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гэта ўжо традыцыя: лёс звяздоўскіх прызоў вырашаюць зусім не звяздоўцы, — дзелавыя партнёры газеты, яе чытачы, то-бок госці. На гэты раз у канферэнц-зале газеты мелі шчасце прымаць арганізатара продажаў «Белсаюздрука» Наталлю Віктараўну Таўстыку і адданых падпісчыкаў «Звязды» мінчан Таццяну Віктараўну Камчыц і Міхаіла Барысавіча Шляхціна (*на здымку*). Менавіта яны (і, дарэчы, вельмі прыгожыя людзі!) з нашага чароўнага капелюша выцягвалі карткі шчаслівчыкаў. Такім чынам,

**дрыль Bosch EasyImpact 500 выйгралі:**

**Аляксей Васілевіч Шчэрба, г. Кобрын Брэсцкай вобласці;**

**Сцяпан Сцяпанавіч Даргель, в. Воўкаўшчына Мёрскага раёна Віцебскай вобласці;**

**Ірына Віктараўна Дзянісенка, г. Гомель Гомельскай вобласці;**

**Чэслаў Станіслававіч Найловіч, в. Жалабы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці;**

**Міхаіл Іванавіч Мірановіч, в. Мышкавічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці;**

**Віктар Уладзіміравіч Дзёмічаў, г. Клецк Мінскай вобласці;**

**Таццяна Іванаўна Цяцеркіна, г. Мінск.**

**Суперпрыз — універсальны набор інструментаў Yato — выйграла Аксана Уладзіміраўна Белікава, г. Мінск.**

Віншуем шчаслівчыкаў!

Тым жа, каго ўдача (і, магчыма, зноў) абмінула, яшчэ раз скажам: не засмучайцеся. Выпісвайце «Звязду», прысылайце карткі на розыгрыш... Вам таксама пашанцуе!

**Афіцыйна**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэкламная гульня «Звязда» — руплівым гаспадарам!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 27.02.2019 г. (пасведчанне № 3495) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 7 сакавіка да 30 чэрвеня 2019 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2019 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 158 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.



# Чэслаў Немен: жыццё як песня-лёс

**Мінскае выдавецтва «Чатыры чвэрці» падаравала чытачу сапраўды ўнікальную кнігу.**

Нагадаем: герой кнігі, ці, хутчэй, кнігі-фотаальбома альбо фотакнігі, — Чэслаў Немен, сапраўдным імя і прозвішча якога Чэслаў Юліўш Выджыцкі. Вакаліст, кампазітар, мультыінструменталіст, аўтар тэкстаў. Уладальнік шасці залатых і аднаго плацінавага дыска. Нарадзіўся на Гародзеншчыне 16 лютага 1939 года. Пайшоў з жыцця 17 студзеня 2004 года. У яго амаль 65 гадоў умясцілася наўздзіў яркае, поўнае мастацкіх, музычных адкрыццяў жыццё. Словы самога музыканта: «Сваю песню Dziwny jest ten swiat я напісаў супраць крывадушных адносін паміж людзьмі, супраць інтрыг і пачуцця зайздрасці. Я разумеў, што як толькі заспяваю такую песню, то нешта зменіцца вакол мяне. Што людзі будуць узрушаны, як і я быў узрушаны сваёй песняй...» Чэславу было 19 гадоў, калі ў яго родны вёсцы закрылі касцёл і бацька прыняў няпростае рашэнне пераехаць у Польшчу...

У кнізе няшмат інфармацыі пра музычнае, мастацкае станаўленне Немена як таленавітага музыканта. Пра гэта ўжо напісалі і яшчэ, пэўна, напішуць дзясяткі, а хутчэй за ўсё — сотні кніг. Выдадуць манаграфіі, а мо — і персанальныя энцыклапедыі. Таму ж, зразумела, і цікавасць да гэтага выдання ў большай ступені выклікана прывязанасцю аповеду да родных мясцін музыканта. Старыя Васілішкі, касцёл, частыя прыезды музыканта і кампазітара — тэма тэксту і багатага ілюстрацыйнага матэрыялу. У 1970-я гады наш суродзіч часта гастраляваў у розных гарадах Савецкага Саюза. У 1976 годзе му-




зыкант даў інтэрв'ю беларускай журналістцы Веры Савінай. Фотаздымак, на якім адлюстравана яе гутарка з Неменам, быў падараваны дому-музею музыканта ў Старых Васілішках. Вера Савіна ў суаўтарстве з Аляксандрам Нілавым зняла дакументальны фільм «Гэты дзіўны свет...» (2009 год). Вера Савіна пры падтрымцы захопленых творчасцю польскага музыканта і кампазітара беларускага паходжання Віталя Раковіча і Аляксандра Амшэя і зрабіла кнігу «Чэслаў Немен», выдадзеную ў выдавецтве «Чатыры чвэрці». Вера Савіна, якая з'яўляецца аўтарам тэксту, — сцэнарыст больш як трыццаці дакументальных фільмаў, журналіст. Віталь Раковіч — фатограф, дызайнер. Ён — аўтар канцэпцыі фотакнігі, яе дызайну. Аляксандр Амшэй — начальнік аддзела турыстычнай і інвестыцыйнай дзейнасці ўпраўлення эканомікі Шчучынскага райвыканкама. Ён з'яўляецца кансультантам, рэдактарам выдання.

Літаральна кожная старонка кнігі «Чэслаў Немен» — пранікненне ў свет музычнага мастацтва, адкрыццё крынічных вытокаў вялікага таленту.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# БАНКАЎСКАЯ КАРТКА І РАХУНАК СОТАВАГА: ДВА Ў АДНЫМ

## МТС і банк Дабрабыт прэзентавалі прадукт для безнаяўных разлікаў

Магчымасць карыстацца пластыкавай карткай, грошы на якой «прывязаны» не да банкаўскага рахунку,



**Аляксандр ВАЛАДЗЬКО — намеснік старшыні праўлення банка Дабрабыт.**

а да балансу мабільнага тэлефона, неўзабаве з'явіцца ў абанентаў МТС. Інавацыйны прадукт створаны мабільным аператарам МТС, банкам Дабрабыт і Mastercard. Карткай можна аплачваць тавары, камунальныя паслугі, разлічвацца ў кафэ і здымаць з яе наяўныя. Разлічваючыся па картцы «МТС Грошы», можна тым самым атрымаць да 10 % кэшбэку на паслугі сотавай сувязі.

Картку можна таксама падключаць да сэрвісу Samsung Pay і разлічвацца на касе, дакранаючыся мабільным да тэрмінала. МТС Грошы — добрае рашэнне для дзіцяці ці бацькоў-пенсіянераў, запэўнілі стваральнікі ўнікальнай распрацоўкі, прэзентуючы яе падчас выстаўкі «ТІБО-2019».

*— Гэта карысны і зручны прадукт, які па сваіх тэхнічных якасцях не саступае стандартнай банкаўскай пластыкавай карты. З яго дапамогай можна здзяйсняць усе аперацыі, даступныя трымальнікам банкаўскіх картак. Карыстацца ёю за мяжой, пераводзіць грошы праз інтэрнэт і тэрміналы,* — адзначыў **Аляксандр ВАЛАДЗЬКО, намеснік старшыні праўлення банка Дабрабыт.**

Акрамя таго, сродкі на картцы можна папаўняць, пераводзіць іх на іншыя карткі, атрымліваць СМС-апавяшчэнні пра рух грошай і адсочваць баланс у рэжыме рэальнага часу ў праграме «МТС Грошы».

*— Прадукт атрымаўся вельмі няпростым тэхналагічна, і гэта адна з яго асноўных вартасцяў. Яшчэ адзін важны момант — праграма лаяльнасці, якая будзе матываваць кліентаў здзяйсняць яшчэ больш*



**На фота справа налева — Старшыня Праўлення банка Дабрабыт Ігар ЛІХАГРУД, Генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ, глава Прадстаўніцтва Mastercard у Беларусі Вадзім ГАЛОЎЧЫЦ.**

*плацяжоў у зручным і бяспечным фармаце,* — пракаментаваў **Вадзім ГАЛОЎЧЫЦ, віцэ-прэзідэнт міжнароднай плацёжнай сістэмы Mastercard у Беларусі.**

Пры гэтым пераводзе грошай на рахунак будзе адбывацца без камісій, проста праз папаўненне балансу нумара тэлефона.

*— Мы стартуем з паняццем «бясплатная сувязь»,* — заявіў **Дзяніс ЦЯРЭШЧАНКА, кіраўнік дэпартамента маркетынгу МТС.** *— Грошы, якія кліент безнаяўным спосабам траціць па картцы, вяртаюцца ў выглядзе кэшбэку, і сувязь будзе практычна поўнасцю бясплатнай, калі хоціць спажываць сродкі.*

Карыстацца новым прадуктам досыць проста. Трэба ўсяго толькі кантраляваць стан рахунку. У кліента будзе картка, якую можна выкарыстоўваць як звычайную банкаўскую, аднак гэта ўсё ж рэзервовы спосаб разлікаў, кажуць стваральнікі новага сродку. Хаця гэта зусім новае рашэнне ў Беларусі, з часам картка, як плануецца, папоўніцца новымі сэрвісамі.

*— Вялікая колькасць нашых абанентаў прысутнічае ў інтэрнэце, і вельмі важна, каб ім было зручна здзяйсняць усё, што неабходна, у гэтым віртуальным асяроддзі. Літаральна ў маі з'явіцца першыя ўладальнікі нумароў МТС, якія змогуць аформіць такую бескантактавую картку,* — мяркуе **Уладзімір КАРПОВІЧ, генеральны дырэктар кампаніі МТС.** — *Неімянныя карткі будуць выдавацца на тры гады ў салонах сувязі тэлекамаператара. Заказаць іх можна таксама праз праграму «МТС Грошы».*

За ўсімі тэхналогіямі павінен быць сэнс, і ён у зручнасці. Мы аб'ядналі ў адзін прадукт дзве зразумелыя рэчы: банкаўскую картку і мабільны тэлефон. Аднак за кожным рашэннем стаіць вельмі складаная сістэма, кажуць стваральнікі карткі. Яе выпуск і абслугоўванне будуць бясплатнымі, як і плацяжы па картцы, аднак трэба памятаць, што, напрыклад, за здыманне наяўных, выкарыстанне мабільнага і інтэрнэт-банкінгу будзе брацца камісія.

**Ірына СІДАРОК, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, фота Андрэя САЗОНАВА.**



**Дзяніс ЦЯРЭШЧАНКА — кіраўнік дэпартамента маркетынгу МТС.**

УНП 800013732
СААТ «Мабільныя ТэлеСістэмы»